1. *Миронов, В. В.* Философия и метаморфозы культуры / В. В. Миронов. – М. : Современные тетради, 2005. – 424 с.
2. *Тер-Минасова, С. Г.* Язык и межкультурная коммуникация : учеб. пособие / С. Г. Тер-Минасова. – М. : Слово, 2000. – 624 с.

УДК [008+94](476):930.253

***А. Я. Паўлава,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»,*
*г. Мінск, Беларусь*

## МАТЭРЫЯЛЫ АСАБІСТЫХ ФОНДАЎ СУПРАЦОЎНІКАЎ БДУКМ ЯК КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

**Анатацыя.** Прадстаўлены вынікі вывучэння матэрыялаў з асабістых архіўных фондаў першага рэктара Мінскага інстытута культуры А. Л. Петрашкевіча, доктара мастацтвазнаўства, прафесара Г. І. Барышава і фальклорыста, прафесара І. К. Цішчанкі, якія захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. Аўтар даследуе рукапісы, нататкі, публікацыі і фотаздымкі аб жыцці і дзейнасці выбітных выкладчыкаў. Робіцца выснова аб ступені рэпрэзентатыўнасці матэрыялаў для выкарыстання іх у якасці крыніц па гісторыі і культуры Беларусі.

**Ключавыя словы**: асабістыя архіўныя фонды, супрацоўнікі БДУКМ, гістарычныя крыніцы, рукапісы, прафесійная і грамадская дзейнасць, навуковыя даследаванні, беларускі тэатр, этнаграфія.

***E. Pavlova,***
*PhD in History, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Historical and Cultural Heritage of the Educational Institution "The Belarusian State University of Culture and Arts",*
*Minsk, Belarus*

## MATERIALS OF PERSONAL ARCHIVAL FUNDS OF BSUCA EMPLOYEES AS SOURCES ON THE HISTORY AND CULTURE OF BELARUS

**Abstract.** The article presents the results of studying materials from the personal archival collections of the first rector of the Minsk Institute of Culture A. Petrashkevich, Doctor of Art History, Professor G. Baryshev and folklorist Professor I. Tishchenko, which are stored in the Belarusian State

Archive-Museum of Literature and Art. The author examines manuscripts, notes, publications and photographs about the life and work of outstanding teachers. The conclusion is made about the degree of representativeness of the materials for their use as sources and on the history of culture of Belarus.

**Keywords**: personal archival funds, Rector and Professors of BSUCA, historical source, manuscripts, professional and social activities, scientific research, Belarusian theater, ethnography.

Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ) з’яўляецца галоўным месцам захавання асабістых збораў дзеячаў культуры і мастацтва. Сярод 445 (2022 г.) асабістых фондаў зберагаюцца 3 фонды супрацоўнікаў сённяшняга БДУКМ – першага рэктара А. Л. Петрашкевіча, доктара мастацтвазнаўства Г. І. Барышава і прафесара І. К. Цішчанкі.

Адметнай рысай асабістых архіўных фондаў можна назваць захаванне ў іх розных відаў крыніц з шырокім ахопам галін жыцця грамадства ў залежнасці ад ступені творчай, навуковай і грамадскай дзейнасці асобы-фондаўтваральніка.

У спісе фондаў БДАМЛМ першы рэктар Мінскага інстытута культуры А. Л. Петрашкевіч азначаны як драматург, празаік, публіцыст, кінасцэнарыст. Фонд налічвае 5866 дакументаў за 1928–2007 гг., сабраных у 2 вопісы. Матэрыялы, прысвечаныя ўрачыстаму адкрыццю інстытута, згрупаваны ў асобную справу [17]. У гэтай жа справе можна азнаёміцца з планам урачыстага адкрыцця ўстановы. Захаваліся і рукапісы прамоў 1 кастрычніка 1975 г., дзе рэктар пазначыў, што «гэта пачэсны і вялікі гонар быць першымі, але яшчэ большы абавязак застацца першымі ў аснове тых традыцый, якія мы закладваем сёння», а таксама выказаў шчырую ўдзячнасць «людзям, што адбудавалі для нас такі цудоўны палац» [14, арк. 1–3 ; 17, арк. 3]. Як вынікае з прамовы аднаго з афіцыйных гасцей, задача для педкалектыву інстытута ставілася наступная: з першых дзён рыхтаваць «высокакваліфікаваных спецыялістаў культурнага фронту» [17, арк. 4–5]. 22 фотаздымкі рэктара з выкладчыкамі, студэнтамі і гасцямі таксама ёсць у фондзе [27]. А. Л. Петрашкевіч кіраваў інстытутам нядоўга. І калі ён пераходзіў на пасаду загадчыка аддзела культуры ЦК КП(б)Б, удзячныя супрацоўнікі і выкладчыкі зрабілі для свайго першага рэктара ліст-падзяку з асабістымі подпісамі [17, арк. 13].

У зборы першага рэктара захаваліся 2 фатаграфіі пасяджэнняў вучонага савета Мінскага інстытута культуры [28],

канспект лекцыі «Тэатр і драматургія» [18, арк. 1–10] і матэрыялы да першага нумара літаратурна-мастацкага альманаха «Альфабэт» (Спр. 572–574). Сярод друкаваных выданняў можна пазначыць буклет нашай УВА за 1995 г., у якім змешчана фота Пастановы Савета Міністраў БССР аб стварэнні Мінскага інстытута культуры [26].

Як сапраўдны навуковец кандыдат гістарычных навук А. Л. Петрашкевіч сур'ёзна ставіўся да напісання драматургічных твораў: ён звяртаўся да гістарычных крыніц і навуковых даследаванняў. У якасці прыкладу можна прывесці картатэку выпісак драматурга да п'есы «Напісанае застаецца» пра Ф. Скарыну [20, арк. 1–89]. У асобную справу вылучана тэматычная падборка дакументаў і навуковых артыкулаў пра перыяд IX–XIII стст. і даследаванні «Слова пра паход Ігаравы» для п'есы «Меч Рагвалода» [21] .

У Год гістарычнай памяці лагічна звярнуцца да матэрыялаў асабістага фонду, маючых дачыненне да падзей ваеннай гісторыі краіны. У асобную адзінку захавання згрупаваны сабраныя А. Л. Петрашкевічам даведачныя матэрыялы і рукапіс п'есы «Катастрофа розуму» [22, арк. 1–140]. У зборы захаваўся каталог выстаўкі «Асвенцым – трагедыя XX стагоддзя» (выданне ГАРФ), буклет «Экскурсія ў Трасцянец» і прыкладная схема гэтага канцлагера [23, арк. 1–28]. Для ваенных гісторыкаў будзе карысна даследаваць 7 адзінак захавання з матэрыяламі да напісання дакументальнай аповесці С. П. Шмуглеўскага «Яны перамаглі смерць» аб дзеяннях падпольнай арганізацыі Асінторфа Віцебскай вобласці.

З 1991 г. па 1998 г. А. Л. Петрашкевіч з'яўляўся кіраўніком арганізацыйна-метадычнага цэнтра па выданні гісторыка-дакументальных хронік «Памяць» пры Міністэрстве культуры і друку Рэспублікі Беларусь. У фондзе сабраны крыніцы, якія адлюстроўваюць выданне хронік: арганізацыйна-распарадчыя дакументы вышэйшых органаў улады аб выданні хронік, палажэнні аб цэнтры па выданні хронік «Памяць», рэкамендацыі па зборы матэрыялаў і напісанні тэкстаў артыкулаў да кніг «Памяць», планы-праспекты кніг хронікі па раёнах [15]. У асабістым зборы ёсць і матэрыялы аб рабоце IV з'езда Добраахвотнага аб'яднання аховы помнікаў гісторыі і культуры ў 1981 г.; удзеле А. Л. Петрашкевіча ў рабоце мастацкага савета пры

Міністэрстве культуры БССР у 1980-я гг. і Беларускага фонду культуры [19].

Даследчыкі гісторыі беларускага тэатра знойдуць у фондзе спецыяльнае выданне: нумар беларускай газеты «Арлекін» за сакавік-красавік 1997 г., прымеркаваны да 50-годдзя Беларускага саюза тэатральных дзеячаў [25, арк. 1–4].

Сярод дакументаў збору знаходзіцца ліст у ЦК КП(б)Б М. А. Савіцкага пра стан развіцця манументальнага мастацтва ў краіне. Аўтар пісаў аб перавазе ў рэспубліцы архітэктараў-будаўнікоў над архітэктарамі-мастакамі. На яго думку, такое становішча прыводзіла да разумення манументальнага мастацтва як дэкаратыўна-прыкладных упрыгожваючых уставак са спалучальнай прывязкай да архітэктуры. М. А. Савіцкі пазначаў, што архітэктура заўсёды была галіной мастацтва і прапаноўваў перайсці да распрацоўкі тэматычных заданняў пры забудове гарадоў [24, арк. 1–2].

Наступны асабісты збор – фонд доктара мастацтвазнаўства, загадчыка кафедры тэорыі культуры і мастацтва Г. І. Барышава. Ён значна меншы за фонд А. Л. Петрашкевіча (усяго 90 архіўных спраў за 1924–1978 гг.). У складзе фонду знаходзіцца варыянт кандыдацкай дысертацыі «Тэатральна-дэкаратыўнае мастацтва Беларусі (1917–1941 гг.)» за 1958 г. [7], 2 тамы дадаткаў да доктарскай дысертацыі «Летапіс тэатральнага жыцця Беларусі», створаных у 1963–1965 гг. [8]. Да асабліва каштоўных дакументаў архівісты аднеслі ніколі не друкаваны «Біябібліяграфічны слоўнік дзеячаў прыгоннага тэатра Беларусі канца 18 – пач. 19 ст.» у 4 частках (1956–1978 гг.) [9]. У фондзе захаваліся аўтабіяграфіі беларускіх тэатральных мастакоў В. Волкава, Я. Ганкіна, А. Грыгар'янца, І. Пешкура, дасланыя Гурыю Іларыёнавічу для працы над дысертацыяй [12, арк. 1–13]. Увагу даследчыкаў прыцягне аўтограф бяседы Г. І. Барышава са скульптарам З. І. Азгурам за 1960 г. З. І. Азгур распавёў пра батлеечныя тэатры, знойдзеныя ім у Лукомлі, Сянне і Чашніках падчас старшынства ў студэнцкай краязнаўчай арганізацыі ў Віцебску ў 1925 г. [5, арк. 1–4]. Карыснымі для спецыялістаў будуць тры справы з аўтографамі працы Г. І. Барышава «Выбітныя людзі зямлі беларускай» [11].

Мастацтвазнаўцам будзе цікава пачытаць машынапісны аўтограф лібрэта да балета «Марыйка» («Лёс балерыны») пра

танцоўшчыцу тэатра графа Зорыча [4, арк. 1–11]. Спецыялісты па гісторыі касцюма могуць азнаёміцца з аўтарскім варыянтам сцэнарыя тэлеперадачы «Людзі і моды» [3, арк. 1–24]. У асабістым зборы маюцца рэцэнзіі Г. І. Барышава на мастацкае афармленне спектакляў абласных тэатраў (воп. 2, спр. 13–17). У складзе матэрыялаў другога вопісу захаваліся праекты слоўніка да 2-га тома «Збору помнікаў гісторыі культуры Беларусі» [10]. Адказным за навуку ва ўстановах вышэйшай адукацыі спецыялістам будзе цікава пазнаёміцца з матэрыяламі кафедры гісторыі тэатра народаў СССР Дзяржаўнага інстытута тэатральнага мастацтва за 1960-я гг. У асабістым фондзе захаваўся службовы допіс аб падрыхтоўцы навуковых кадраў на імя рэктара ўзгаданай установы ад загадчыка кафедры Г. Гаяна з разважаннямі, якія змены маглі б пасадзейнічаць паляпшэнню сітуацыі з падрыхтоўкай дактароў мастацтвазнаўства. Прафесар настойваў: для стварэння навуковага даследавання неабходна зменшыць колькасць службовых даручэнняў дактарантаў [6, арк. 1–21].

Трэці архіўны фонд – асабісты збор загадчыка кафедры фальклору прафесара І. К. Цішчанкі – даволі вялікі (2203 дакументы за 1958–2011 гг. і фотакопіі дакументаў за 1836–1939 гг.). Значная частка ўяўляе сабой збор матэрыялаў і вынікаў навуковых даследаванняў Івана Кірылавіча. Вопіс матэрыялаў пачынаецца з яго кандыдацкага дысертацыйнага даследавання «Беларуская частушка. Пытанні генезісу жанру» [30, арк. 1–262]. Картатэка на 1249 частушак, сабраных для дысертацыі, згрупавана ў шэсць спраў [31]. У чатыры адзінкі захавання аб'яднаны аўтографы матэрыялаў доктарскай дысертацыі «Гісторыя беларускай фалькларыстыкі другой паловы XIX ст.» (яны складаюць 442 лісты). У архіўным фондзе фалькларыста зберагаецца і велізарная падборка няказачнай прозы, датаваная 1983 г.

Для гісторыкаў і этнографаў будзе карысна пазнаёміцца з аўтографамі рукапісаў манаграфіі «Да народных вытокаў». У БДАМЛМ маюцца рукапісы глаў пра Рускае геаграфічнае таварыства; жыццёвы і творчы шлях, навуковыя погляды і фальклорную спадчыну А. Кіркора і І. Насовіча (Ф. 457. Воп. 1. Спр. 24–28). У маладых выкладчыкаў цікавасць выклікаюць чарнавыя варыянты лекцый па этналогіі і міфалогіі, прачы-

таных прафесарам І. К. Цішчанкам у Беларускім універсітэце культуры ў 1993–2000 гг.

Асабісты фонд утрымлівае артыкулы даследчыка пра вядомых фалькларыстаў і этнографаў. Значная колькасць матэрыялаў сабрана І. К. Цішчанкам падчас яго даследавання пра няпросты лёс выбітнага беларускага опернага спевака М. І. Забэйды-Суміцкага. У асобным раздзеле вопісу размешчаны сабраныя І. К. Цішчанкам для даследаванняў фотакопіі дакументаў з розных архіваў і бібліятэк СССР.

У гэтым зборы даследчыкі знойдуць надрукаваны на чэшскай мове ў часопісе «Абазрэнне славянскай літаратуры» артыкул Я. А. Ляцкага пра Якуба Коласа «Паэт адраджаючайся Беларусі» і яго пераклад, зроблены невядомым аўтарам [34, арк. 1–16]. У спецыялістаў па гісторыі Заходняй Беларусі, музеязнаўстве і фальклоры можа выклікаць цікавасць ліст-адказ кіраўніцтва Баранавіцкага краязнаўчага музея на запыт І. К. Цішчанкі пра лёс зборніка рэвалюцыйных песень, надрукаванага камітэтам КПЗБ. У 1927 г. ён быў выкарыстаны польскімі ўладамі падчас суда над рэвалюцыянерамі. Выданне спачатку было ўключана ў збор Слонімскага краязнаўчага музея, потым перададзена ў Баранавіцкі музей [33, арк. 1].

І самы цікавы матэрыял для супрацоўнікаў БДУКМ – рукапіс інтэрв'ю І. К. Цішчанкі з першым рэктарам Мінскага інстытута культуры А. Л. Петрашкевічам з нагоды яго 70-годдзя. Асноўнымі тэмамі размовы сталі пасляваеннае дзяцінства, выбар прафесіі і вучоба на юрыдычным факультэце, праца ў ЛКМСБ, БелСЭ, Мінскім інстытуце культуры, грамадская дзейнасць. Пра сваю працу на пасадзе рэктара Мінскага інстытута культуры Алесь Лявонавіч засведчыў наступнае: «Мне падаецца, што Інстытут культуры быў па мне і я па ім. Пакінуць Інстытут і вярнуцца ў ЦК лічу асноўнай памылкай свайго жыцця» [32, арк. 1–18].

Такім чынам, асабістыя фонды супрацоўнікаў БДУКМ утрымліваюць у сваім складзе вялікую колькасць дакументальных, наратыўных і выяўленчых крыніц, якія дазваляюць праводзіць даследаванні па развіцці навукі, культуры, гісторыі Беларусі і нашага ўніверсітэта.

1. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ). – Ф. 131. (Г. І. Барышаў). Воп. 1.
2. БДАМЛМ. – Ф. 131. (Г. І. Барышаў). Воп. 2.
3. БДАМЛМ. – Ф. 131. Воп. 1. Спр. 10.
4. БДАМЛМ. – Ф. 131. Воп. 1. Спр. 11.
5. БДАМЛМ. – Ф. 131. Воп. 1. Спр. 15.
6. БДАМЛМ. – Ф. 131. Воп. 1. Спр. 35.
7. БДАМЛМ. – Ф. 131. Воп. 2. Спр. 1.
8. БДАМЛМ. – Ф. 131. Воп. 2. Спр. 2–3.
9. БДАМЛМ. – Ф. 131. Воп. 2. Спр. 4–6.
10. БДАМЛМ. – Ф. 131. Воп. 2. Спр. 28–30.
11. БДАМЛМ. – Ф. 131. Воп. 2. Спр. 31–33.
12. БДАМЛМ. – Ф. 131. Воп. 2. Спр. 34.
13. БДАМЛМ. – Ф. 450. (А. Л. Петрашкевіч). Воп. 1.
14. БДАМЛМ. – Ф. 450. Воп. 1. Спр. 227.
15. БДАМЛМ. – Ф. 450. Воп. 1. Спр. 507–516.
16. БДАМЛМ. – Ф. 450. Воп. 1. Спр. 543.
17. БДАМЛМ. – Ф. 450. Воп. 1. Спр. 570.
18. БДАМЛМ. – Ф. 450. Воп. 1. Спр. 571.
19. БДАМЛМ. – Ф. 450. Воп. 1. Спр. 648–650.
20. БДАМЛМ. – Ф. 450. Воп. 1. Спр. 794.
21. БДАМЛМ. – Ф. 450. Воп. 1. Спр. 800.
22. БДАМЛМ. – Ф. 450. Воп. 1. Спр. 802.
23. БДАМЛМ. – Ф. 450. Воп. 1. Спр. 803.
24. БДАМЛМ. – Ф. 450. Воп. 1. Спр. 860.
25. БДАМЛМ. – Ф. 450. Воп. 1. Спр. 870.
26. БДАМЛМ. – Ф. 450. Воп. 1. Спр. 882.
27. БДАМЛМ. – Ф. 450. Воп. 1. Спр. 921.
28. БДАМЛМ. – Ф. 450. Воп. 1. Спр. 923.
29. БДАМЛМ. – Ф. 457. (І. К. Цішчанка). Воп. 1.
30. БДАМЛМ. – Ф. 457. Воп. 1. Спр. 1.
31. БДАМЛМ. – Ф. 457. Воп. 1. Спр. 2–7.
32. БДАМЛМ. – Ф. 457. Воп. 1. Спр. 97.
33. БДАМЛМ. – Ф. 457. Воп. 1. Спр. 133.
34. БДАМЛМ. – Ф. 457. Воп. 1. Спр. 234.